№ 10. Панядзелак, 14 лістапада (1 ноября) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Што чуваць у сьвеце?

Вашынгтонская канфэрэнцыя.

Злучаныя Штаты Амэрыкі пададуць на Вашынгтонскай канфэрэнцыі праект новай сувязі народаў, якая павінна заступіць Лігу Народаў і заняцца зьмяншэньнем ваарaужэньня розвых гаспадарстваў.

Няможна спаганяць даўгоў.

Старшыня дзяржаўнага банку Злучаных Штатаў на сходзе банкіраў заявіў, што Эўропа вінавата Амерыцы 10 біліёнаў даляраў. Калі-б Амерыка патрэбавала заплаціць гэты доўг, дык Эўрапэйскія дзяржавы былі-б развалены, а Амерыка згубіла-б эўрапэйскія рынкі; дзякуючы гэтаму, Злуч. Штаты адмовяцца ад большай часьці эўрапэйскіх даўгоў.

Трэба скасаваць усе ваенныя даўгі.

Быўшы канцлер брытанскага казначэйства Мак-Кена, прамаўляючы ў Чыкаго, заявіў, что па яго думцы варта было-б скасаваць усе ваенныя даўгі, якія толькі шкодзяць гаспадарчаму адраджэньню сьвета.

Ня хочуць каралёў.

У Будапэшце прыняты народным соймам у трэцім чытаньні закон аб пазбаўленьні права Габсбургаў на трон, аб чым паведамлены дзяржавы Антанты.

Доля Карлы.

Партугальскі ўрад даў згоду на зьмяшчэньне Карлы на востраве Мадэйра.

Забіўства міністра ў Японіі.

Старшыня японскіх міністраў Гара забіты на вакзале ў Токіо пры выхадзе яго на пляцформу. Забіў малады японец, якому ўсяго 18 гадоў. Яго злавілі. Забіў за палітыку.

Французы баяцца, што Нямеччына збанкруціцца.

Француская газэта „Matin“ зьвяртае ўвагу Пуанкарэ, што Нямеччына мае замер абвесьціць банкруцтва дзеля ўхіленьня ад сваіх забавязаньняў. Пуанкарэ адказаў, што Францыя гатова крыху папусьціцца, калі будзе гарантыя выплаты належных грошай.

Новы старшыня прускіх міністраў.

Прэм'ер-міністрам прускага кабінэту выбраны соцыяліст Барун.

Рабочыя з рабочымі згаворацца.

Па ўсіх буйнейшых цэнтрах Верхняе Сьлезіі адбыліся вялікія сходы рабочых. Пастаноўлена выпусьціць адозву да польскіх і нямецкіх рабочых аб зьнішчэньні ўзаемнага тэрору, а таксама аб трэбаваньні павялічэньня платы з прычыны дарагоўлі, якая ёсьць рэзультатам абніжэньня нямецкай маркі.

Нямеччына і Польшча.

Гаспадарчыя польска-нямецкія перагаворы маюць пачацца каля 20 лістапада ў Аполе ці ў Жэнэве.

Расея плоціць Польшчы золата.

Газэта „Kur. Por.“ паведамляе, што ў лік першага ўзносу савецкі ўрад заплаціў польскаму пасольству ў Маскве 1.600.000 рублёў золатам.

Справы Расеі.

20 сьнежня адбудзецца ўсерасейскі сьезд радаў.

З Масквы паведамляюць, што савецкія ўлады выдалі дэкрэт аб скасаваньня рэквізыцыяў і канфіскацыяў. Рэквізыцыі дапушчаюцца ў вынятковых выпадках і пры поўнай аплаце вартасьці таго, што рэквізуецца, а канфіскацыі можна рабіць толькі па пастанове суда.

З прычыны чацьвёртых угодкаў кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі абвясьцілі амністыю салдатам, якія ваявалі проці Савецкае Расеі ў арміях Дэнікіна, Колчака, Врангэля, Савінкова, Балаховіча й Пятлюры. Афіцэраў амністыя не датычыць.

Маскоўскі камісарыят фінансаў выпрацаваў праект акцызных падаткаў са сьпіртных напіткаў, чаю, цукру і кавы. Будуць заведзены падаткі на зямлю і на даходы.

Савецкая прэса паведамляе, што паміж бальшавікамі, меншавікамі й бундаўцамі зроблена згода. У раду народных камісараў будуць уваходзіць меншавікі і бундаўцы.

У Нью-Йорк прыехалі Мілюкоў і Аўксеньцьеў, як упаважненыя расейскай эміграцыі на вашынгтонскую канфэрэнцыю дзеля азнаямленьня яе з сапраўдным палажэньнем справаў у Расеі.

Савецкі Урад ізноў патрэбаваў ад Румыніі выдачы Махно.

Справы Ірляндыі.

Лёйд-Джордж далажыў у парламэнце аб ірляндзкіх перагаворах і выказаў надзею на добры канец.

Грэкі напалі на Албанію.

Грэкі ў паразуменьні з Юга-Славіяй уварваліся на тэрыторыю Албаніі.

Грэкі мірацца з Турцыяй.

Паводлуг вестак з Лёндану, Грэцыя гатова прыняць насрэдніцтва саюзных дзяржаў дзеля ўрэгуляваньня непаразуменьня з Турцыяй.

Чаго хочуць туркі-кемалісты.

Ангорскі ўрад пастанавіў паслаць спэцыяльныя місіі ў Англію, Францыю і Амэрыку, каб азнаёміць палітычныя кругі вялікіх дзяржаў з міравымі варункамі Анатоліі.

Юга-Славія.

6 лістапада адбылася ў Белградзе прысяга канстытуцыі караля Аляксандра.

Латвія.

Лацьвійскаи міністэрства прасьветы прыняло праект агульнай адукацыі.

Лацьвійскі ўрад ізноў паслаў пратэст проці высылкі з Расеі ў Лацьвію ўцекачоў жыдоў.

Аб выбарах у Віленскі Сойм

Выбары і беларусы.

Старшыня Галоўнай Камісіі па выбарах у Віленскі Сойм граф Грабоўскі ў сераду 9 лістапада, паўторна быў у прадстаўнікоў Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту, хочучы даведацца, як Камітэт адносіцца да справы Сойму.

На заяву беларускіх прадстаўнікоў, што пазыцыя Нац. Камітэту застаецца няяснаю да апублікаваньня афіцыяльнага дэкрэту аб выбарах у Сойм, граф Грабоўскі сказаў, што яму невядома па якой прычыне дэкрэт дасюль ня выданы.

(„Бел. Зв“).

Выбары і жыды.

У прайшоўшы панядзелак старшыня жыдоўскае абшчыны доктар Выгодзкі, перадаў камісару галоўнай выбарнай камісіі графу Грабоўскаму, што пакуль не апублікаваны дэкрэт аб скліканьні Сойму, жыдоўскае насяленьне стрымліваецца ад рашэньня пытаньня, ці будзе яно мець дачыненьне да выбараў, ці не. Толькі пасьля апублікаваньня дэкрэту і поўнага азнаямленьня з ім жыдоўскія партыі вынясуць свае рашэньне. („Б. З.“).

„КРЫНІЦА“.

Віленская газэта беларускіх хрысьціянскіх дэмакратаў „Крыніца“, уладаю Сярэдняе Літвы прычынена на не азначаны час і аштрафована на 10.000 польскіх марак.

Апроч таго, п. Аляксюк у газэце „Еднасьць“, пагражае „прыцягнуць да адпаведнасьці перад судом рэдактара „Крыніцы“.

Украінскае жыцьце.

З 1-га сьнежня 1921 г. „Украінскае Слова“, якое выхадзіла дагэтуль у Бэрліне што аўторка й пятніцы, будзе выхадзіць штодзенна, апроч нядзель і сьвяточных дзён. Рэдакцыйнае кіраўніцтва будзе ў руках прафэсара Зьмітры Дарашэнкі і дацяперашняга рэдактара д-ра Зэнона Кузэлі. Паасобныя аддзелы будуць весьці: палітычны—прафэсар д р Стэфан Тамашыўскі, літэратурны і навуковы—прафэсар Богдан Лэпкий.

Лёйд Джорд заявіў у парлямэнце, што Вярхоўная Рада бязумоўна рассьледуе пытаньне аб Усходняй Галіцыі пасьля ўрэгуляваньня іншых польскіх справаў.

Паўстаньне Пятлюры супроць Маскоўшчыны і бальшавікоў задаўлена.

Літоўскае жыцьце.

Віленская літоўская гімназія.

Заняткі віленскай літоўскай гімназіі часова адбываюцца ў будынку жыдоўскай гімназіі. З 15 лістапада літоўская гімназія пераходзіць ва ўласны дом № 12 на Піліпаўскай вуліцы.

Віленская літоўская каапэрацыя.

Каапэратыў „Біруга“ (Зарэчча, 10) выдае прадукты па харчавых картачках асобам, прыпісаным да зачыненага каапэратыва „Ляймэ“ (Сьвятаянская, 23).

Міністры нацыянальных меншасьцяў.

З Коўні паведамляюць, што замест д-ра Салавейчыка літоўскім міністрам жыдоўскіх спраў мае быць доктар Бруцкус, вядомы сыоніст. Літоўскім міністрам беларускіх спраў і дагэтуль застаецца п. Сямашкас.

Чэскае Консульства.

У Коўні адчынена чэскае консульства. Консул п. Яма ўжо прыбыў да Коўні.

Літоўская нота Лізе Народаў

Урад Літоўскай Рэспублікі выслаў да Лігі Народаў ноту, у якой пералічаець чараду фактаў у Вільні ў адносінах да літоўскага насяленьня: 1) закрыцьце адміністрацыйнаю ўладаю дзявочай гімназіі, налічаўшай 200 вучаніц; 2) высяленьне з займаных будынкаў 1-га кастрычніка літоўскай гімназіі, вучыцельскай сэмінарыі, вышэйшай пачаткавай школы, курсаў для дарослых. Школы гэтыя налічалі 1000 вучняў. Высяленьне споўнена ваарaужонай паліцыяй, каторая нягодна абхадзілася з вучнямі і вучыцялямі; 3) высяленьне 5-га кастрычніка 240 дзяцей з літоўскага прытулку, прычым 30 асоб службы выкінута на вуліцу; 4) высяленьне другога прытулку літоўскіх сірот і рэквізыцыя будынку ўладаю для патрэб выхадцаў, прыбыўшых з Польшчы; 5) высяленьне 4-га кастрычніка літоўскага інтэрнату на прадмесьці Вільні: 6) закрыцьце 5 кастрычніка аддзелу літоўскага банку для гандлю і промыслу, прычым забраты ўсе дакумэнты і грошы; 7) адмова ў рэестрацыі літоўскіх каапэратываў, а потым закрыцьце іх, як незарэестраваных. Склады літоўскай супалкі зачынены толькі дзеля таго, што яны—ўласнасьць літоўскага таварыства.

Далей нота кажа, што няма тут асабістай недатыкальнасьці, што літоўская прэса ўсьцяж караецца, што такім чынам польская ўлада стараецца заціснуць усякі ёй супраціvак, дзеля чаго літоўскі ўрад просіць Лігу Народаў, каб узяла пад сваю апеку літоўскіх жыхароў Вільні і зрабіла канец перасьледаваньню іх польскаю ўладаю. (Е. Е).

Рэзалюцыя па дакладу Гуманітарнай сэкцыі.

Сэкцыя дапамогі ахвярам вайны і голаду, маючая ў сваім складзе прадстаўнікоў ад Беларускага Чырвонага Крыжу, ад Беларускага Камітэту дапамогі галадуючым і ад Беларускаг Таварыства дапамогі ахвярам вайны, просіць Беларускую Нацыянальна Палітычную Нараду давесьці да ведама ўсяго сьвету, што:

1. З 1914—1917 гадоў тэрыторыя Беларусі была арэнаю жастокіх бояк паміж Расейскай і Нямецкай арміямі. У працягу гэтых трох страшных гадоў імпэрыялістычнай бойкі дабрабыт нашага працоўнага народу і яго гаспадарка зусім зруйнаваны.

2. Па Брэст-Літоўскай умове, падпісанай паміж Расеяй і Нямеччынай проціў волі і галасных пратэстаў нашага народу, Беларусь была аддадзена пад цяжкую акупацыю нямецкай арміі, якая зрабіла з гэтай акупацыі—цяжкую кабалу для нашага краю і народу, страшэнна іх разарыўшую.

3. Пасьля адходу нямецкіх войскаў, зараз-жа ім на зьмену прыйшла яшчэ горшая і яшчэ цяжэлейшая акупацыя імпэрыялістычнай Польшчы.

Мала таго, — у той час, як іншыя народы, якчэскі, бяльгійскі, літоўскі і іншыя абясьсіленыя імпэрыялістычнай вайной, змаглі, пасьля Версальскага міру, жыць спакойна і аднаўляць свой дабрабыт,—Беларусь захапіла новае цяжкое гора: яна стала арэнай новай імпэрыялістычнай бойкі паміж Савецкай Расеяй і Польшчай, і зноў многа пакутны Беларускі край задыміўся пажарамі і абліваўся крывёю.

4. Па Рыскаму трактату Беларусь цынічна падзелена паміж Савецкай Расеяй і Польшчай, якія сьвядома вядуць Беларускі Народ да поўнага матарыяльнага і духоўнага ўпадку.

5. У часе Міравой Вайны каля 2 000 000 беларускіх жыхароў Горадзеншчыны і Віленшчыны былі прымусова выселены ў глыбіню Расеі, у Сыбір, Туркестан і Каўказ, дзе яны ўжо сем гадоў жывуць у галіце і страшэнных няхватках і нямаюць ніякай магчымасьці вярнуцца на Бацькаўшчыну.

У працягу гэтых мінулых гадоў Расейскае Савецкае і Польскае правіцельствы ня толькі не дапамагаюць нашым бежанцам вярнуцца ў Родны Край, але наадварот—робяць усялякія перашкоды іх звароту ў Беларусь. А цяперака, калі ад вужаса перад галоднаю сьмерцьцю ў Паваложы, дзесяткі тысяч бежанцаў-беларусаў рынуліся на Бацькаўшчыну, Польскі Урад ня пускае іх праз граніцу і абракае ўсіх іх на галодную сьмерць у пагранічным дроце. Тым беларускім бежанцам, якія нягледзячы на польскія заставы і рызыкуючы сваім жыцьцем, прабіраюцца на родную зямельку, тым, якія вярнуўшысь дамоў знаходзяць спаленымі да-тла свае вёскі і хаты, а на сваёй зямельцы бачуць новага гаспадара - польскага жаўнера, пасаджанага сюды Польскім Урадам, тым беларускім уцекачом, якія гэткімі парадкамі змушаны жыць і карміцца пабіраючыся ў суседніх вёсках,— гэтым беларускім мучальнікам не даецца ніякай абсалютна дапамогі, хоць у той жа час дапамагаецца бежанцам расейскім і частцы ўкраінскіх.

6. Дзесяткі тысячаў сыноў Беларусі, прымусова узятых у расейскае войска, ходам падзей апынуліся цяперака ў канцэнтрацыйных лагерах Турцыі, Балгарыі і Сэрбіі.

7. Сотні лепшых сыноў нашай Бацькаўшчыны сядзяць цяперака ў бальшавіцкіх і польскіх турмах і церпяць голад, холад і варожыя зьдзекі над іх нацыянальным пачуцьцем.

Сучаснае становішча Беларускага Народу невынасіма цяжкое ня толькі таму, што вытрымаў ён дзьве страшэнных вайны, ня толькі таму, што ён і да гэтага году церпіць ад варожых акупацыяў, але яшчэ і таму, што Эўропа нічым не дапамагла яму падняцца з мук і няволі, а ўвесь культурны сьвет і да гэтага часу астаецца бязучасным і спакойна глядзіць на мукі беларускага народу.

Ня гледзячы на невынасіма цяжкое становішча беларускіх уцекачоў у Расейскіх бальшавіцкіх турмах і на прымусовых работах, а таксама уцекачоў-беларусаў, зьвярнуўшыхся ў родны край пад польскую акупацыю,—ні Расейскае Савецкае, ні Польскае правіцельствы не дазволілі беларускім дабрачынным арганізацыям і установам зрабіць абсьледаваньне іх і прыйці ім на помач.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада ў Празе зварачваецца да ўсіх культурных нацый, да ўсіх грамадзянскіх і дабрачынных арганізацый і устаноў, а ў першую чаргу да Жэнэўскага міжнароднага Чырвонага Крыжа, з гарачай просьбай дапамагчы Беларускаму Народу праз яго дабрачынныя арганізацыі.

Сыты галоднаму не спагадае.

(Беларуская прыказка).

Увесь сьвет, здаецца, падняўся на помач галадуючым у Расеі. Толькі ў нас нічога ня робіцца толькі мы як быццам і ня відзім і ня чуем таго страшэннага гора, якое перажываюць нашы браты па веры і па духу ў Савецкай Расеі.

Гэй, пара пачуць, увідзіць і ўзяцца за падзержку галадуючых.

Трэба ў Вільні арганізаваць Беларускі Камітэт з аддзяленьнямі ў павятовых гарадах, а нам, духавенству, аддаць усю энэргію на збор ахвяр для галадуючага духавенства, дзяцей і міран. Калі мы у гэткі час, час Божага пасяшчэньня, ня зробім добрай справы, мы ня будзем пастыры, а наемнікі.

Духавенства ўва главе з сваімі япіскапамі павінна першае падняць свой голас на ратунак гінучых ад голаду непавінных людзей.

Я веру, на наш кліч адзавуцца усе нашы парахвіяне.

Япіскапы, сьвяшчэньнікі і ўсе дзеячы беларусы, спагадайце галодным!

Сьвяшчэньнік Г.

А дзе-ж Сойм?

Каторы ужо раз мы чуем, што вось-вось склікаецца ў Вільні Сойм з усіх абшараў Сярэдняй Літвы, а Сойму ўсё няма і няма.

Апошнімі днямі толькі й гутаркі было, што аб Віленскім Сойме, які меўся быць скліканы як найхутчэй. Казалі і пісалі ў газэтах, што выйдзе дэкрэт аб выбарах і самае палажэньне аб іх. Гаварылі аб зьменах у складзе урадуючай камісіі Сярэдняй Літвы, аб тым, што ген. Мокшэцкі будзе заменяны гр. Мэйштовічам-б. сябром Расейскай дзяржаўнай Рады Гаварылі і яшчэ аб адным: быццам ген. Жэлігоўскі пакідае свае месца.

І толькі гаварылі, бо ні дэкрэту аб Сойме няма, нічога іншага—так сама. Відаць, што нешта такое здарылася, што спыніла і скліканьне Сойму і розныя зьмены ў складзе урадуючых сфэр Сярэдняй Літвы. Як піша Віленская „Rzeczpospolita“, прычынай неапублікаваньня дэкрэту аб выбарах трэба шукаць у вобласьці „вялікай паміжнароднай палітыкі“.

Безварункова, так яно і ёсьць.

Справа аб Віленшчыне ёсьць справа спрэчная і павінна быць аканчальна вырашана Лігай Народаў, якая ніколі ня згодзі-

цца з абмінаньнем сваіх правоў кім-бы то ні было.

Што-б ні гаварылі аб бяссільлі Лігі Народаў правесьці ў жыцьцё свае пастановы, —ня зусім яно так. Ліга Народаў мае досыць спосабаў, каб не прыбягаючы да аружжа прымусіць непакорнага сябра слухацца.

Пастановы Лігі Народаў абавязковы для усіх яе сяброў. Як-жа будзе выглядаць той сябра, каторы, узаходзячы ў склад сяброў Л. Н. не выпаўняе усіх абавязкаў, прынятых па сябе. Ліга Нацый можа сказаць такому сябру: раз ты адмаўляешся падпарадкавацца нашым пастановам, то або выходзь з складу сяброў Л. Н., або-ўсе іншыя нашы пастановы, карысныя для цябе, мы не правядзем у жыцьцё.

Мы ня ведам, наскольні правільна, быццам Ліга Народаў, вырашаючы справу Горнай Сьлезіі на карысьць Польшчы, абварункавала яе згодай Польшчы на другі праект Гюманса.

Чуткі гэтыя ходзяць у тутэйшых палітычных сфэрах, але не зьяўляюцца ні ў воднай газэце. Дапушчаем, што чуткі гэтыя беспадстаўныя. Але ўсё-ж такі факт астаецца фактам, што пытаньне аб Віленшчыне Ліга Народаў лічаць такім, якое не павінна быць вырашана нікім, апрача Лігі Народаў. Толькі Ліга Народаў, а ні Польскі урад, ні Літоўскі (ковенскі) урад, ні ген. Жэлігоўскі ня маюць права тым ці іншым спосабам самы вырашыць справу аб Віленшчыне.

Вось чаму і Віленскі Сойм, які так проста, здаецца, склікаць, ніяк ня можа быць скліканы.

„Вялікая паміжнародная палітыка“ перамагае ўсё і ўсіх і, не сумляваемся, пераможа.

А справа магла-б выглядаць іначай, каб сучасныя палітыкі Польшчы і Сярэдняй Літвы ня трацілі часу на выдумываньне спосабаў „wcelenia“ Віленшчыны ў Польшчу, — будзь то праз „уставадаўчы“ Сойм ў Вільні ці праз „orzekające zebranie“, — на якую тэму вядуць нескончальны спор п. п. Хомінскія і Обсты.

Мы хацелі-б падказаць каму сьледуе, што Сойм у Вільні мог бы быць скліканы тады, калі выбары абымуць усе абшары на ўсход ад лініі Кэрзона, г. ё. тэрыторыі Гродзеншчыны, Віленшчыны і Меншчыны, і калі аб ніякім „wceleni“ ня будзе і мовы. Тады Ліга Народаў, быць можа, і згадзілася-б на Сойм у Вільні.

М. К.

Першая беларуская баляда „Нячысьцік“ Аляксандра Рыпінскага.

А. Рыпінскі быў родам з Дзісеншчыны. Ен хадзіў на паўстаньне 1831 г., пасля чаго мусіў уцякаць за граніцу. Як эмігрант, жыў у Парыжы. У 1839 годзе чытаў там сярод эмігрантаў лекцыі па беларусазнаўству.

А. Рыпінскі лічыў беларусаў за польскае племя, а Беларусь за польскую правінцыю. Памылковасьць пагляду давадзіла яго аж да таго, што ён хацеў, каб „беларускія мужычкі“ вучыліся спачатку чытаць, а тады гаварыць і думаць папольску.

Свае лекцыі па беларусазнаўству Рыпінскі надрукаваў у 1840 годзе ў Парыжы асобнай кніжкай пад назовам „Białoruś“ (Беларусь). Тут між іншым, зьмесьціў ён беларускія псальмы („О мой Божа веру Табе,“ „Стары Восіп барадаты,“ „Хімка з Агаткаю—дзьве маладзіцы“), прыклад мешанага польска-беларускага верша („Лямант раскаханага“) і інш. Зьмесьціў тут Рыпінскі і кавалачкі паэмы Я. Баршчэўскага „Рабункі мужыкоў,“ кажучы, што яна пашырана па ўсёй Беларусі, як народны твор, што і беларусы маюць творы, падобныя да украінскай „Энеіды“ І. Катлярэўскага. Аб беларускай-жа „Энеідзе“, які аб тым, хто напісў „Рабункі мужыкоў,“ ён ня ведаў. Паважна займацца на вукай беларусазнаўства пачаў Рыпінскі толькі ў эміграцыі, затужыўшы па бацькаўшчыне, але ня меў там патрэбных матарыялаў і крыніц для свае работы, дык у кніжцы зьмесьціў прыклады беларускай творчасьці найболей напамяць, як чуў змалку ўдаму. У „Беларусі“ выказаў ён і свае пагляды. Для беларускай мовы ён завёў у гэтай кніжцы асобыя значкі сярод лацінскіх літэраў. Пазьней А. Рыпінскі, захапіўшысь роднай беларушчынай, напісаў беларускую баляду „Нячысьцік“. Есьць яшчэ яго вершык ў „Альбоме Дарэўскага-Вярыгі,“ гэта—„Ты-ж сам, суседзька, хацеў“... У тым вершыку апалячаны пісьняр-шляхціц аб сваёй беларускай лірыцы кажа так:

Можа гэта ня песьнь? Каша?
Ды ўсёж такі свая, наша!

Калі А. Рыпінскі напісаў баляду „Нячысьцік,“ невядома. Яна выдзержала ў сваім часе аж тры выданьні, два ў Парыжы і адно ў Лёндане (1853 г.). Прадмова для баляды напісана папольску.

Не кажучы аб тым, што баляда „Нячысьцік“ ня маець літэратурнай вартасьці з боку ідэйнага, бо аўтор яе зусім няўдала, наіўна карыстае з народных забабонаў, яна й па спосабу напісаньня стаіць аж для таго часу даволі нізка. Верш слабы, вялы, далёкі ня толькі ад бойкасьці народнай гутаркі, але і ад удачных кніжных беларускіх твораў, напісаных раней за гэтае баляды музыкальным вершам. Калі разглядзіць словы Рыпінскага з альбомнага вершыка ды параўнаваць іх з нахілам усей яго творчасьці, дык можна сказаць, што ў беларускай літэратурнай працы яго загубіла няправільная нацыянальная і соцыяльная самасьвядомасьць. Выданьні А. Рыпінскага мелі для нас у пасяродку мінулага сталецьця некаторае палітычнае значэньне, як чутны для Заходу голас аб беларускай справе. Апрача таго, кніжка „Беларусь“ маець для нас этнаграфічную цану, але таксама невялічкую.

Дзеля таго, што баляда „Нячысьцік“ дагэтуль шырокай беларускай масе зусім невядома, праваслаўнымі беларускімі літэрамі ніколі не друкавалася, а лектары гісторыі беларускай літэратуры ня маюць магчымасьці прачытаць яе сваёй аудыторыі, —мы яе друкуем тут, карыстаючы з ласкі паважанага Антона Луцкевіча, знайшоўшага сьпісак баляды ў архіве свайго нябожчыка брата Івана Луцкевіча і перадаўшага ўласнаручную копію для друку ў „Беларускіх Ведамасьцях.“

НЯЧЫСЬЦІК

(беларуская бальляда).

Часта, братоньку, вядзеш тое-сёе,
А ўсё то марна, а ўсё пустое.
Таму ўжо сто лет будзе—
Старые помняць то людзі,
Скажаць вам і Апанас:
Жыў-быў Мікіта у нас
На самым канцы сяла.
Там яго хатка была,
Дзяцей ня меў, хоць жанат,
А быў бедзен—не багат.
Багацтва ён усяго
Меў вяпра аднаго.
Ды не спажыў і таго:
У мясаед яго ня біў,
На продаж, кажуць, карміў,
І так даждаўся паста.
Душа-ж Мікіты праста:
Ен у сяле усім сват,
Суседзям дораг, як брат;
Суседзі яго любілі,
А чым маглі—тым дарылі.
І вот так ён сабе тлеў:
„Іван зрабіў—Іван зьеў!“
Часам, праўда, і упіўся,
Ды з нікім ён не сварыўся,
Толькі-ж, на бяду сваю,
Імеў жонку, як зьмяю:
Ці цьвяроза, ці п'яна,
Як ведзьма была яна!
Каб яе паляруш біў!
Ніхто яе ня любіў.
Чуць, было, запеў пятух,
Яна ўжо із хаты шух!
Ну ж да жыда ў карчму бегч,
А хто папаўся на ўстрэч,
Тут крыку поўна было,
Аж прабудзіла сяло.
І муж спакою ня меў:
Ні ён выпіў, ні ён зьеў,
Ні прачнуўся, ані спаў,
Каб чорт яе не наслаў!
То крычала, то кляла,
І так за нос узяла,
Што бедны ўжо мужык
Вот так ўжо к тому прывык,
Што ей аддаў і штаны!
Памаглі-ж ей шатаны.
Кажу: Мікіта ня жыў,
Пакорны як цяля быў,
Што хацела, то рабіў:
Паслала ў карму—ішоў,
Ці ў Вялікдзень, ці ў Пакроў,
Ці ў мясаед, ці ў пост
(Знаць, што і ён ня быў прост).

(Далей будзе)

Ізноў аб беларуска-польскіх адносінах.

Каб паказаць, што ўсё беларускае грамадзянства, вельмі дружна выступаючае ў справе беларуска-польскіх адносін, аднолькава глядзіць на роль у гэтых адносінах п. Аляксюка, — мы тут зьмяшчаем артыкул з „Крыніцы“, газэты беларускага каталіцкага сялянства.

„Крыніца“ піша: „Есьць справы, аб якіх і цяжка і сумна пісаць, але трэба, бо вымагае гэтага дабро шмат вышэйшае і важнейшае, як нашы асабістыя няпрыемнасьці. Такой справай ёсьць беларускі адступнік Паўла Аляксюк.

Аляксюк, гэта той беларускі вырадак, які ў сваей „працы“ прадусім кіруецца сваей асабістай карысьцю, а аб справе беларускай, аб сьвятлейшай долі беларускага сялянства ён ня рупіцца і ня думае. Аб розных цёмных яго справах на крыўду Беларускаму Народу мы тут, ведама, гаварыць ня будзем. Такая гутарка завяла-б нас за далёка ды й асоба Аляксюка нягодна таго, каб над ёй дзўжэй затрымлівацца. Мы тут, каб у пару прасьцерагчы прад нягоднай Аляксюка работай нашу вёску, наша грамадзянства, а таксама і грамадзянства суседняе, успомнім толькі тое, што ён цяпер робіць, за каго яго маюць лепшыя Палякі і як да яго адносіцца усё беларускае грамадзянства.

Ужо на пачатку сваей „палітычнай“ працы Аляксюк, сярод шырокіх кругоў беларускіх дзеячоў, выклікаў рознага роду падазрэньні і недаверлівасьць да яго асобы, бо ён заўсёды паступаў ня так, як паступаюць справядлівыя Беларусы. Апошнім-жа часам Аляксюк зусім адкрыта махнуў рукой на справу беларускую, зьнюхаўся з панамі-эндэкамі, дастаў ад іх грошы і пачаў зусім нягодную процібеларускую работу. Залажыў газэту „Jednaść“, пісаную нейкім беларуска-польска-расейскім жаргонам, і ў гэтай газэце больш бароніць справы польскія, як беларускія. Заснаваў таксама нейкую „сувязь“ і назваў яе цэнтральнай, а ў склад яе увайшоў сам і некульні безадказных беларусаў, якім усё роўна, хто ім грошы заплаціць. Ад гэтай „сувязі“, знача ад самога сябе, Аляксюк часта робіць рознага роду выступленьні прад Палякамі на некарысьць Беларусаў. Калі нядаўна быў Беларускі Зьезд у Празе, дык прабаваў туды дастацца і ён. Ці яго на Зьезд упусьцілі, ня ведаем; ведаем толькі тое, што Аляксюк, каб паказацца сябе прад Палякамі надта добрым, на гэты Зьезд столькі налгаў у польскія чарнасоценныя газэты (іншыя ня прынялі), што аж сорам. Ня мінуў нат' і такога усімі Беларусамі і Палякамі паважанага і заслужонага аднаго са старэйшых Беларусаў грам. інжынэра Л. Дубяйкоўскага. На яго Аляксюк зрабіў фальшывы данос у гэныя варожыя да нас польскія газэты, што быццам Дубяйкоўскі на Зьездзе ў Празе галасаваў ня так, як трэба было галасаваць... Дык вось, аб усім ведама не гаворачы, такой больш-менш работай займаецца цяпер Аляксюк.

Тут слушна могуць нас запытацца, чаму-ж Аляксюка Палякі трымаюць і даюць яму грошы і за каго яны яго маюць?

Трымаюць Аляксюка, плацяць на яго проціў беларускую працу грошы і наагул яго лічаць сабе патрэбным ня ўсе Палякі. Лепшага польскага грамадзянства ў Вільні пагляд на Аляксюка і свае да яго адносіны дасканальна выразіла газэта „Słowo Ludowe“ (23. X. 21) (быўшае „Słowo Wileńskie“) якая, ганячы палітычныя паступкі Тупальскага прадстаўніка ў нас Польшчы, з агідай піша такія словы:

„У справах беларускіх зьвязаўся (Тупальскі—Рэд.) з Аляксюком, якога ўсе ягоны вспулбратымцы (пасłoўна—Рэд.) уважаюць за адступніка і які ня мог мець ніякага значэньня, загадаў (Тупальскі—Рэд.) яму (Аляксюку—Рэд) у ягонай „Jednaści“ больш бараніць справы польскія, як беларускія, і думаў, што Беларусы на гэта зловяцца. Адначасна адапхнуў (Тупальскі) групу беларускіх дзеячоў, жадаючых разьвіваць сваю культуру і палітыку, апёршыся аб Польшчу“... Гэтых слоў даволі, каб праканацца, як лепшае пастуроўшае польскае грамадзянства адносіцца да Аляксюка. Яго адпіхае і гардзіць ім, як нягодным інтрыгантам, дзеля асабістых мэтаў перашкаджаючым у справе польска-беларускага паразумленьня. Аляксюк патрэбны толькі такім Паляком, як Обст, і іншым заклятым нашым ворагам, каб праз яго душыць беларускую справу і капаць глыбокую магілу пад нашым бяздольным сярмяжным беларусам-хлебаробам.

З сумам, з больлю ў грудзёх, беларусы глядзяць на гэтую юдаву, здрадніцкую Аляксюкоўскую работу! Цяжка перанесьці відавочную крыўду для нас з боку якога чужынца, горка глядзець на гэта бяздольле нашага сялянства, але бязконца жудасна і балюча бачыць, як родны сын, стаўшыся адступнікам, цынічна падносіць рукі на сваю Маці, і нажом прабівае ёй грудзі! Браце Аляксюк, апомніся! Ты-ж па крыві наш, цябе-ж выдала на свет беларуская кабета—твая маці, ты-ж сын нашай шэрай, сумнай і загнанай старонкі Беларусі... Ня сьцягвай на сябе праклянцьця гісторыі, праклянцьця ўсяго Беларускага Народу, бо прысуд ягоны страшны, які ня дасьць табе супакою і ў магіле... Горкія гэты словы прымі, браце Аляксюк, не ад твайго ворага і папраўся покуль час...

Усё беларускае грамадзянства, не дачакаўшы ніякай папраўы Аляксюка і ўсьцяж яго бачачы за работай процібеларускай, выкінула зусім з пасярод сябе і доступ яму да сябе забараніла. Няма ніводнай беларускай арганізацыі, якая-б пусьціла ў сябры свае Аляксюка, нямашака ніводнага адказнага беларускага дзеяча, які-б меў што супольнае з Аляксюком. Нат' у беларускі клюб, у які кожны больш-менш парадачны чалавек мае доступ, Рада Старшынь у сваім часе пастанавіла Аляксюка ня ўпускаць.

Пагарджаны і адкінуты сваімі, наняты некаторымі чужымі, усей парай прэць Аляксюк у той бок, адкуль яму паказваюць юдавы срыбнікі, прэць у бяздоньне і... іншых за сабой весьці жадае. Не! Не павядзе, бо ніхто за ім ня пойдзе, як ніхто адказны і запраўды ідэйны ня ідзе і цяпер. І. Сьвятляк“.

Беларусь паміж сваймі суседзямі.

(З „Географіі Беларусі“).

Палажэньне Беларусі

Беларусь ляжыць у самай сярэдзіне Эўропы. Яна займае вялікі кавалак зямлі (каля 300 тысячаў квадратных вёрстаў, альбо 30 міліёнаў дзесяцін), які можна сказаць, з большага мае форму трапэцыі (як сякера) з асноваю ўдаўжкі ў 700 вёр., а ўвышкі ў 550 вёр. (Верхняя аснова мае ўдаўжкі каля 400 вёрст). Значыцца, каб пераехаць цераз усю Беларусь з усходу на захад, прыдзецца ехаць 100 міль, а з паўдня на поўнач—80 міль.

Каб акуратней адзначыць мейсца, дзе ляжыць наша бацькаўшчына на зямной кулі, мы мусім сказаць, што яна ляжыць балей-меней паміж 40 і 52 градусамі ўсходняе даўжыні (лічачы ад Фэрро) і паміж 51 і 57 градусамі паўночнае шырыні. Як раз у заходняй Беларусі ёсьць географічны цэнтр Эўропы (42.5 і 54).

Прастор Беларусі.

Беларусь займае прастору каля 300 тысячаў квадр. вёрстаў альбо 30 міліёнаў дзесяцін. Прастор гэта не малы, Сярод культурных краёў ня шмат такіх, каб мелі балей зямлі, чымсі мае Беларусь, большая часьць гаспадарстваў у Эўропе займае меншы прастор.

Большыя за Беларусь вось якія старонкі—Нямеччына больш у 1½ разы (мае 480 тыс. кв. вёрст), Францыя, Норвэгія, Швэдзія, Гішпанія і Аўстра-Вэнгрыя таксама большыя за Беларусь. Большая за Беларусь і Украіна і Маскоўшчына—гэтыя старонкі маюць найбольш у Эўропе зямлі—Роўна з Беларусьсю зямлі маюць Англія (без каленіяў), Італія і Фінляндыя. А рэшта—Баўгарыя, Румынія, Польшча, Літва, Грэцыя, Сэрбія, Бэльгія, Швайцарыя і шмат іншых маюць зямлі менш чымся ў Беларусі у 2, у 3 і больш таго разоў.

Колькасьць насяленьня і яго шчыльнасьць.

Шмат зямлі ёсьць у Беларусі, ды рэдка народ у ёй жыве. На ўсім прасторы Беларусі жыве ўсяго каля 16 міліёнаў чалавек. Большая часьць зямлі ў нас ляжыць пад бесканечнымі лясамі, пад дзікім балотам. Ворнай зямлі ў нас ня шмат, дый на тэй, якая ёсьць, наш народ гаспадарыць блага бо ляпей ня ўмее. Дык нашая зямля ледзь-ледзь пракармлявае гэтых 16 міліёнаў чалавек.

У Нямеччыне на гэткім самым прасторы жыло-б міліёнаў 45 народу, а ў іншых старонках (напр. у Бэльгіі) шмат балей.

Дзеля гэтага па колькасьці насяленьня эўропэйскія гаспадарствы ўжо ня ў 1½ разы большыя за Беларусь, а ў 3, у 4 разы. Нямеччына мае 65 міліёнаў народу, каля гэтага мае і Англія і Аўстрыя. Меней маюць Італія, Францыя, Украіна, але ўсё-ж шмат балей, чымся Беларусь. У Польшчы, Гішпаніі народу будзе блізка што толькі, колькі і ў Беларусі, а рэшта гаспадарстваў маюць насяленьня шмат меней, чымся ёсьць у Беларусі. Гэткія культурныя старонкі, як Швайцарыя, Фінляндыя, Данія маюць усяго па 3 міліёны, а ў Грэцыі і Норвэгіі па 2 міліёны жыхароў.

Затое з боку гушчыні пасяленьня Беларусь стаіць бязмална ў самым канцы ўсіх Эўропэйскіх гаспадарстваў. У Беларусі на 1 квадратнай вярсьце—кругом бяручы, жыве ўсяго толькі 56 чалавек. Радзей, як у Беларусі, народ жыве яшчэ вось у якіх старонках—у Грэцыі, Гішпаніі, Турцыі, Маскоўшчыне, Швэдзіі і Фінляндыі. У Фінляндыі на 1 кв. вярсьце жывець толькі 10 чалавек. Тым часам старонка гэтая вельмі культурная, —дый людзі там багата жывуць.

Суседзі Беларусі.

З захаду Беларусь мяжуецца з Польшчаю Літвою і Латвіяй.

Даўжыня мяжы з Польшчаю каля 250 вёр. Літвой 400 вёр., Латвіяй 200 вёрст.

На паўдня ад Беларусі ляжыць Украіна. Мяжа з ёю мае даўжыні каля 1000 вёрстаў.

З усходу і поўначы Беларусь аблягае Маскоўшчына. Мяжа з ёю мае даўжыні каля 900 вёрстаў.

Беларусь яшчэ не разьмяжавалася акуратна з сваймі суседзямі. Дзеля гэтага, кажучы аб межах Беларусі, мы разумеем тыя межы, у якіх, як усе згаджаюцца, жыве беларускі народ. Быць можа, што пры ўстанаўленьні межаў які невялічкі лапік беларускае зямлі дастанецца якому суседу, альбо наадварот—дзеля таго, каб межы крыху выпраталіся. Дык межы Беларусі могуць яшчэ зьмяніцца. Цяпер мы даём апісаньне тых толькі межаў, якія аддзяляюць народ Беларускі ад яго суседзяў.

З Польшчаю мяжа ідзе ад м. Мельніка, што ляжыць на р. Бугу, па гэтай рацэ ўніз, пасьля па рацэ Нурцу і далей пераходзіць на рэкі Нарэў і Бобр. Зыйшоўшы з Бабра, граніца кіруецца на Аўгустоў, а адтуль ідзе проста на Друзгенікі, і пераходзіць ужо ў край Літоўскі. Далей граніца з Літвою йдзе праз мястэчкі Дубічы, Эйшышкі, Біняконі, Рудзішкі, Еўе, Падбярэзьзе, Сьвянцяны, Відзы і Езёросы (Нова-Аляксандраўск).

За Езёросамі пачынаецца мяжа з латышамі. Яна йдзець праз Ілукшту, Вышкі, Дагду, Люцын, і да Корсаўкі. Ад Корсаўкі пачынаецца мяжа з Маскоўшчынаю. Яна йдзець праз Апочку, Вялікія Лукі ў кірунку на Ржэў і Зубцоў. Адтуль-жа паварочавае на паўдня і йдзе ў кірунку на Дарагабуж. Не даходзячы гэнага места, граніца паварочавае крыху на ўсход, а пасьля ідзець ізноў у паўднёвым кірунку на места Бранск і далей па рацэ Дзясьне да мястэчка Грэмяча. Ад Грэмяча ўжо пачынаецца Беларуска-Украінская граніца.

Гэная граніца ад Грэмяча ідзець на паўднёва-заход, перасякаючы папалам Чарнігаўшчыну аж пакуль ня трапіць да Дняпра каля м. Любеча. Ад Любеча мяжа йдзе ўніз па Дняпры да ўтоку Прыпяці і там трапляе на старую гістарычную мяжу Беларусі з Украінай, якая йдзе цераз цустынныя лясы і балоты, што ляжаць на паўдня ад Прыпяці. Гэная мяжа ў нядаўныя часы разьдзяляла Менскую і Горадзенскую губэрню ад Валынскае.

Гэткім парадкам даходзіць мяжа Беларусі да Бугу і далей ідзець уніз па ім да м. Мельніка. У Мельніку канчаецца мяжа з Украінаю і пачынаецца мяжа з Польшчаю.

На нашых межах з Маскоўшчынаю праз увесь час гісторыі Беларусі ішлі войны, якія спусташылі месты і вёскі і не давалі людзём добра асесьці і завесьці гаспадарку. Дзеля гэтага тамака даўнейшае поле пазарастала лесам і цяпер Беларусь ад Маскоўшчыны аддзяляюць вялікія лясы Окоўскія, Бранскія і іншыя. Ад Украіны Беларусь аддзелена альбо глыбокімі рэкамі, альбо непраходнымі балотамі. Вялікія пушчы растуць і ўздоўж нашых межаў з Польшчаю (Белавежская, Горадзенская) дый балотаў там даволі. А па нашых межах з Літвою ды Латвіяй няма ні лясоў вялікіх, ні рэкаў, ні балотаў; толькі ось азёраў ёсьць даволі. Ды нам і непатрэбны з таго боку моцныя межы, з гэтымі нашымі суседзямі беларусы заўсёды хаўрусавалі і жылі ў згодзе.

Адміністрацыйнае дзяленьне.

Да вайны 1914 году ўся Беларусь была падзелена на губэрні і паветы. Усіх беларускіх паветаў 62-65. Яны падзелены паміж губэрнямі: Віленскай, Віцебскай, Горадзенскай, Менскай, Магілеўскай, Смаленскай і Чарнігаўскай. Апроч гэтых губэрняў, да Беларусі трэба залічаваць і суседнія паветы іншых губэрняў.

А. Смоліч.

Адносіны Літоўска-Беларускай дзяржавы да Маскоўскага гаспадарства.

(З „Гісторыі Беларусі").

Літоўска-Беларуская дзяржава з самага пачатку свайго істнаваньня ўзяла на сябе заданьне зьбіраньня заходняй часьці рускіх славянаў. У 13 м і ў першай палавіне 14-га сталецьця ў гэтай справе яна ня мела супернікаў. З другой палавіны 14-га сталецьця зьявіўся супернік. Гэта было нарадзіўшаеся ў пачатку 14-га сталецьця Маскоўскае гаспадарства, каторае пачало рабіць зьбіраньне ўсходняй часьці рускіх славянаў. I тая, і другая дзяржавы, пашыраючы свае тэрыторыі, ўрэшце, спаткаліся ў канцы 14-га сталецьця. З гэтага часу і пачнецца змаганьне паміж Літвой і Беларусьсю з аднаго боку і Масквою з другога боку.

Суперніцтва паміж дзяржавамі-зьбірацелямі пачалося праз жаданьне мець уплыў на Цьверскае князьства. Войскі Альгэрда два разы біліся з войскамі вядомага маскоўскага вялікага князя Зьмітры Данскога. У першы раз атрымаў верх Альгэрд, у другі раз Зьмітра Данскі. Літва і Беларусь, занятыя ў гэты час змаганьнем з нямецкімі ордэнамі, прыпынілі, пакуль што, свой рух на ўсход. Зроблена была згода. У адзнаку згоды Альгэрд аддаў сваю дачку замуж за стрэчнага брата Зьмітры—Уладзіміра Андрэевіча.

Згода пры Вітаўце зноў прыпынілася. Паднялася спрэчка з Масквою з-за Ноўгараду і Смаленску. Толькі татары, атрымаўшыя верх над Літвою і Беларусьсю на берагох ракі Ворсклы, не далі магчымасьці Вітаўту пашырыць свой уплыў далёка на ўсход. Усё-ж такі і Ноўгарад і Смаленск павінны былі прызнаць сваю залежнасьць ад Вітаўта. У 1396-м годзе Вітаўт і Васіль I Маскоўскі, зьехаўшыся на параду ў Смаленску, устанавілі мяжу Літоўска-Беларускага і Маскоўскага гаспадарства па рэчцы Угры. Для ўзмацненьня згоды дачка Вітаўта, Настася была выдадзена замуж за Васілія I. У гэты час Літоўска-Беларуская дзяржава ўключае ў свой склад вялікі абшар рускіх земляў. Налажыўшы ўсходнюю мяжу нашай дзяржавы на карту, напрыклад, Расейскай імпэрыі дарэвалюцыйнага часу, мы бачым, што ў склад падуладных Вітаўту земляў уходзяць такія губэрні: Віленская, Горадзенская, Ковенская, Сувальская, Падольская, Валынская, Менская, Магілеўская, Віцебская, Смаленская Кіеўская, Чарнігаўская, Кацярынаслаўская, Херсонская, Арлоўская, часткаю Калужаская і Тульская. Літоўска-Беларуская дзяржава пашыралася далёка на ўсход, яе мяжа даходзіла да сучаснага нам горада Мажайску, за 107 вёрст ад Масквы.

Масква гэтага часу яшчэ ня мае сілы. Вырасшы з невялічкага удзельнага князьства, яна крок за крокам выбіваецца на першае месца сярод асобных удзельных князьстваў. Хоць татары разьбіты на Куліковым полі (1380 г.), але яшчэ іх улада цяжкім каменем ляжыць на маладым Маскоўскім гаспадарсьцьве. Толькі пачынаючы з палавіны 15-га сталецьця ўмовы жыцьця Масквы хіляцца ў лепшы бок. Ідзе хуткае разлажэньне татарскага ханства. Замест аднэй Залатой арды мы бачым некалькі ордаў, каторыя змагаюцца паміж сабою і ўзаемна аслабляюць адна другую. 1480-ы год прыносіць Маскоўскаму гаспадарству вызваленьне ад татарскай няволі. Усе дробныя удзельныя князьствы ўжо страцілі сваю незалежнасьць і ўвайшлі ў склад Маскоўскага гаспадарства. Вырасшая з невялічкага удзелу-вотчыны, Маскоўская дзяржава гэтую ідэю і арганізацыю вотчыны зьберагае і ў далейшы час. Маскоўскі дзяржавец кіруе ў сваёй вялікай дзяржаве так, як некалі яго продкі кіравалі ў сваім удзеле-вотчыне. Ен навет лічыць, што ўсе землі рускіх славянаў—ёсьць яго вотчына. „Вся Руская земля Божіею волею из старины наша вотчина". Маскоўскі князь ужо запомніў, што з „старины" яго вотчынаю быў невялічкі маскоўскі удзел. I, пэўна, справа тут не ў старасьветчыне, а ў моцы. Маскоўскі гаспадар мае цяпер вялікую моц і, апіраючыся на яе, ён лічыць сябе прадстаўніком і уласьнікам усяе Русі. Стары тытул вялікага князя маскоўскага яго ужо не здаволівае і ён прымае тытул вялікага князя, гаспадара Маскоўскага і „всея Руси". Змаганьне за „вотчыну" цягнецца блізка 150 гадоў. Бацькаўшчына наша руйнуецца, палі зарастаюць лесам, усочваюцца крывёю.

У 1491 годзе, калі Літоўска-Беларускім гаспадаром быў абраны Аляксандар Ягайлавіч,—Іван III Маскоўскі, карыстаючыся з разладу паміж Літвою і Польшчай, пачаў вайну за сваю беларускую „вотчыну", якой ніколі ня бачыў ні ён, ні яго бацькі. На дапамогу сабе ён паклікаў татарскага, крымскага хана Мэнглі-Гірэя, для каторага Беларусь хоць і ня была вотчынаю, але была месцам добрай пажывы. Пачаўся пагром нашае бацькаўшчыны з паўдня і ўсходу. Асабліва быў зруйнован Рагачоў: цэннасьці разграбілі, горад спалілі, жыхароў пацягнулі ў няволю ў Маскву. Літоўска-Беларускае гаспадарства павінна было прасіць згоды. Згоду зрабілі, аддаўшы Івану III горад Мсьціслаў. З граматы відаць, што абодвы гаспадары абяцаліся дапамагаць і шанаваць адзін другога. Аляксандар Літоўска-Беларускі ў грамаце піша: „а хто мне вораг, то і я яму вораг. А хто будзе яму друг, то і мне друг, хто будзе яму вораг, то і мне вораг". Каб згоду з Маскоўскім гаспадарствам зрабіць моцнаю, Аляксандар заслаў сватоў да Іванавай дачкі Галены, з каторай потым і ажаніўся. Але і гэта згоды не зрабіла моцнаю.

У аднэй з граматаў Аляксандар не назваў Івана III гаспадаром усяе Русі. Тады Іван III прыслаў Аляксанду „складную грамату", абвяшчаўшую вайну. I вайна пачалася у 1500-м годзе. Каманду над літоўска-беларускім войскам меў князь Канстантын Астрожаскі. У чэрвені вынікла страшэннае збойства каля гораду Дарагабужа. Маскоўскім войскам камандаваў добры знаўца ваеннай справы Даніла Холмскі. Каля 8 тысячаў народу загінула ў бойцы, літоўска боларускія войскі былі разьбіты і ваявода Астрожаскі папаў у маскойскі палон. Яшчэ 3 гады маскоўскія войскі руйнуюць Беларусь. Удзень неба чарнее дымам, а ўночы палае агнём пажараў. Ліецца чалавечая кроў, нішчыцца маемасьць. Скора маскоўскае войска пачало галадаваць у краі, каторы само зьнішчыла і пачаліся перагаворы аб згодзе. У 1503-м годзе замірэньне было падпісана. Масква атрымала Гомель і некалькі мест ў цяперашнім Рагачоўскім павеце. У час гэтага замірэньня, ў 1506-м годзе, памёрлі і цесьць і зяць.

Пасьля іх гаспадаравалі—на Ліцьве і Беларусі брат Аляксандра Жыгімонт II (Стары), а ў Маскве Васіль III, сын Івана III. У 1508 годзе перабег з Літвы ў Маскву варожа настроены да Жыгімонта князь Глінскі. Ен падбіў Маскоўскага гаспадара на вайну з Жыгімонтам. Зноў маскоўскія войскі ўварваліся на Беларусь. Жыгімонт з вялікім, моцным войскам вышаў ім на спатканьне і пачаў гнаць на ўсход. Васіль III павінен быў прасіць згоды. Быў напісаны „вечны мір", па ўмове каторага Маскоўскі гаспадар павінен быў вызваліць князя Астрожаскага і другіх ваеннапалонных.

Вечнасьць згоды цягнулася надта нядоўга, ўсяго 5 гадоў. У 1513-м годзе зноў пачалася вайна. Адбываюцца вялікія бойкі пад Смаленскам і Оршаю. Пад Оршаю гэтман Астрожаскі атрымаў над маскоўскім войскам дзьве пабеды, ня глядзячы на тое, што яго армія была меншаю як маскоўская ў два разы. Ад Оршы ён гнаў маскоўцаў аж да Дарагабужа, 30 тысячаў трупаў беларусаў, ліцьвіноў і маскоўцаў заслалі ўсю гэтую плошчу. Змаганьне бязупынна йдзе далей. Такія гарады, як Полацак, Мсьціслаў, Магілеў, Орша, Рагачоў, Гомель, Віцебск, Смаленск і інш. руйнуюцца па некалькі разоў. Мы ўжо й ня лічым, які страшэнны лік вёсак, невялікіх мястэчкаў было зруйнована за часы гэтатага змаганьня. Усё тое, што зрабіла многавяковая народная праца, гіне. Разгараная зямля зарастае густым лесам. Жыхары бадзяюцца па лясох, хаваючыся там ад збойства і рабаваньня. Прыпыняецца народная творчасьць. Насельнікі краю, бачучы, што барацьбе няма канца-краю, кідаюць свае зруйнованыя гнёзды, кідаюць сваю родную зямлю і бягуць на Украіну. А барацьба ўсё йдзе. Войны аднаўляюцца ў 1516, 1518, 1519, 1534, 1535, і 1536-м гадох. I тая і другая старана, змучаныя змаганьнем, робяць зноў згоду, каторая цягнецца толькі 25 гадоў. Пры Іване IV Грозным, ў 1561-м годзе, зноў пачынаецца, так званая, Лівонская вайна, каторая, так сама, адбывалася на тэрыторыі Беларусі.

Дорага каштавала гаротнаму беларускаму народу імпэрыялістычная думка Маскоўскіх гаспадароў збірацялёў аб тым, што Беларусь ёсьць іх „вотчына".

У. Ігнатоўскі.

ДЭКЛЯМАТАР

Янка Купала.

Агароднік.

(З Некрасава)

На людзей нападаць, забіваць не хадзіў,
Не хадзіў, куды ночкай ідуць цемнякі,
Праз дзяўчыну-красу я свой век загубіў,
Згінуў з ласкі паненкі, шляхоцкай дачкі.
Працаваў я у садзе у панскім вясной;
Вот раз неяк зграбаю сучкі ды пяю,
Глядзь, дачка майго пана стаіць прада мной!
Глядзіць зорка ды слухае песьню маю.
Агароднік дасьціпны, я швэндаўся шмат;
Па дварох па мясцох я багатых бываў,
I наглядзіўся там многа пекных дзяўчат,
А такой-жа ніразу нідзе ня відаў.
Бровы чорныя, стройна й прыгожа была.
Стала жутка, я песьні сваей не дапеў.
А яна?... што-ж яна?... пастаяла, пашла.
Я ж за ею у сьлед, як шалёны, глядзеў.
Ня раз чуў на сяле ад сваіх маладзіц,
Што і сам я прыгож, на пагляд ня брыдкі,
Як той сокал, гляджу, кругдаліц, белаліц,
Валасы нібы лён, сам ўвесь стройны такі.
Разыгралася сэрца з вясёлай душой,
Ды як глянуў я тут на пакоі яе,
Засьвістаў і махнуў маладзецкай рукой,
Дый скарэй за мужыцкія думы свае.
А прыходзіла-ж часта яна з той пары,
Пагуляць, паглядзець на работу маю,
I сьмяецца са мной, і крычыць: гавары,
Чаму неяк прыўныў і даўно не пяю.
Я-ж маўчу, ад чаго смуцен стаў, не кажу,
Галаву зьвешу толькі на белую грудзь.
„Пазволь, яблынку я за цябе пасаджу;
Ты ўмарыўся, пара, знаць, табе аддыхнуць".—
„Што-ж такое, паненка, вазьмі, на, паўчысь,
Памажы мужыку, папрацуй крыху й ты!
Ды як брала рыдлёўку ў мяне сьмяючысь,
Тут пярсьцёнак убачыла мой залаты.
Ад пахмурнага дня вочы сталі цямней,
На губах, на шчаках разыгралася кроў,
„Што з табою, паненка? чаму на мяне
Няпрыветна глядзіш, хмурыш чорную броў?"—
„Скуль узяў, скажы мне, ты пярсьцёнак такі?"—
„Скора будзеш старой, як усё будзеш знаць".
„Дай мне! я пагляджу, незгаворны які!"
I за палец мяне ручкай беленькай хвадь!...
Пацямнела ў вачах, душу кінула ў дрож,
Я даваў, не даваў ей з пярсьцёнкам руку,
Дый прыпомніў тут, знаць, што і сам я прыгож,
I, ня знаю ўжо як, цмок! паненку ў шчаку.
З таго часу з ёй шмат скаратаў я начэй,
Многа шчасьця зазнаў, ў ясны вочы глядзеў,
Расплятаў, заплятаў касу сьветлую ей,
Цалаваў, мілаваў, песьні родныя пеў.
Мігам лета прашло, ночы сталі сьвяжэй,
Пад дзень шэрань, мароз пад нагамі скрыпіць.
Вот раз неяк скрадаўся ў пакоі я к ей,
Аж хтось-цап! і „зладзея дзяржы" тут крычыць.
Так злавілі мяне, на дапрос прывялі;
Я стаяў і маўчаў, гаварыць не хацеў.
Красату з галавы вострай брытвай зьнясьлі,
I жалезны убор на нагах зазьвінеў.
Асьцябалі сьпіну і пагналі дружка
Ад радзімай старонкі у дальні краёк
На бяду і нуду. Знаць, любіць ня рука
Мужыкам, нам хамулам, ды панскіх дачок.

Якуб Колас.

Пісьмо з турмы.

— Напішы мне, калі ласка,
Пісямко да хаты!
Піша з дому мне Параска,
Што сын здан ў салдаты..
Охо-хо! Пракоп ўздыхае
У смутку і ў кручыне;
Белы ліст ў руках трымае
I канвэрцік сіні.
Просіць шчыра грамацея,
Навет шапку скінуў;
Сам Пракоп пісаць ня ўмее,—
Гдзе-ж, ў бядноце гінуў;
Вырас ў вёсцы на мякіне,
Жыў з худобай з малку,
Цяжар жыцьця зьнёс на сьпіне,
Высах ўвесь у палку;
Наастатку, вось, папаўся
У сьпісак арыштанцкі,
За то, быццам, што зьбіраўся
Лес падкурыць парскі.
—Што-ж табе пісаць, старэнькі?
— А пішы, нябога:
Жонка, сын мой дарагенькі!
Шлю паклон з вастрога.
Сэрца мне баліць, і вас я
З думак ня спускаю,
Кожны божы дзень і час я
Дом свой ўспамінаю.
Жонка мая дарагая!
Ты ня крыўдзь Івана.
Калі грошай не хватае,
Пазыч у Сьцяпана;
Няхай дзядзька не баіцца—
Аддамо з падзякай —
Хлопцу-ж трэба хоць акрыцца,
А ня йсьці сабакай.
Спраў кажух яму і боты,
Выпраў, як і людзі,
Дай з сабою колькі злоты—
Весялейшы будзе...
Калі досыць корму маеш,
Падкармі больш сьвінку,
Мо' якую захаваеш
На Вялікдзень шынку;
А калі на грош няхватка,
Або корму мала,—
Закалі і з поўдзесятка
Хунтаў прышлі сала...
Сын мой! Снасьці рыбаковы
Добра ты прыпратай,—
Згодзяцца; а венцер новы—
Маеш час—залатай;
I яшчэ, мой сын, прашу я,
Човен кінь ў адрыне,
Няхай вецер ня сьвідруе,
Няхай так ня гіне.
Усё, што можна, захавайце,
Пакуль я вярнуся.
Нераток стары аддайце
Міхалю з Габрусем.
Кнігі ўсе, апроч псалтыра,
Вы аддайце Грышку,
Няхай іх чытае шчыра,
Бо ён любіць кніжку...
Дарагі мой сын! прад здачай
Да мяне зайдзі ты,
Бо мо больш і ня убачу,
На пачую, гдзе ты.
Не маркоцьцесь, не бядуйце,—
Дасьць Бог спосаб новы.
Што-ж ты зробіш? пагаруйце...
Будзьце ўсе здаровы!—

Алесь Гарун.

***

Ты, мой брат, каго зваць беларусам,
Роднай мовы сваей ня цурайся;
Як ня зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся!
Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,
Гэта скарб нам адзін захаваўся,
У сялянскай аграбленай хаце
Толькі ён незабраны астаўся.
У старыну беларус, не падданы,
Гаспадырыў, быў сам над сабою
I далёка у сьвеце быў знаны
За літоўскай і ляшскай зямлёю.
Але час прамінуў, і нядоля
На народ, як-бы камень, зваліласць,
Беларуская слава і воля
Адыйшла, адцьвіла, закацілась.
Не зьмяняючы шэрай апраткі,
Працаваў ты, як вол, гаратліва,
А у хаце тваей недастаткі,
А на ніве тваей неўрадліва.
А чаму? Ты няздольны, ці хворы,
Ці благі гаспадар, ці п'яніца?
Мусіць не! Бо і іншым у пору
У цябе гаспадарыць паўчыцца.
Сьветлы розум твой, брат, але дзетак
Ад цябе, як і ўсё, адбіралі
I на бацькаўскай родны палетак
Працаваць — памагаць ня пушчалі.
Хто хацеў, той і сьмеў рабаваці,
Бяз прыпросу зьяжджаліся госьці
Абдзіраць, аб'ядаць, апіваці
I крышыць гаспадарскія косьці.
Мажа-б ты і памёр і загінуў,
Каб ня вешчая мова баяна,
Хто-ж быў добры, яе хоць пакінуў?
Як жа так, што яшчэ не забрана?
Бо што бачылі госьцікі-гэрцы
I зямлю, і лясы, і кілімы, —
Усё забралі. А мову у сэрцы —
У сваім сэрцы хавалі-нясьлі мы.
Дык шануй, беларус, сваю мову —
Гэта скарб нам на вечныя годы,
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацьця-народы!

Максім Багдановіч.

Калісь глядзеў...

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асьляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы?
Калісь глядзеў на сонца я!
Няхай усе з мяне рагочуць,—
Адповедзь вось для іх мая:
Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асьляпіла вочы.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

М. **Крынкі** Горадзенскага павету.

Пан войт нашае гміны на неафіцыяльных паперках раздаў загады па вёсках, каб сяляне сабралі з кожнай дзесяціны па 4 хунты жыта, 5 хунтаў бульбы, 1½ хунта ячменю і па 7 лотаў тлушчу, вытлумачыўшы мэту гэтае зборкі словам: „па nauczycielstwo" (па вучыцялёў). Дык вось нашыя сяляне дзівяцца і ніяк ня могуць сьцяміць, чаму „па nauczycielstwo" загадваюць сабіраць харчы у той час, калі гэтае вучыцельства атрымоўвае пэнсыю? Другія не здаволены тым, што трэ' даваць шмат харчоў, а дзіцяці ніводнага да школкі не пасылаюць, бо школка польская, а яны ўсе беларусы. Беларускае школы няма, дзеці нашыя дзеля гэтай прычыны ня вучацца, дык нас застаўляюць падтрымліваць чужое „nauczycielstwo".

Супрон Дзяга.

Двор **Беніца** Ашмянскага павету.

Прышлося мне праходзіць праз Беніцкую воласьць. Сустрэўся з адным жыхаром, папрасіў агню. Закурылі. Папытаўся я, што чуваць у яго вёсцы і як жывецца. Мужык уздыхнуў і пачаў гаварыць аб тым ды аб сім, казаў ён шмат чаго, але найлепш мне запомнілася гэтае: „Сёлета сенажаць у пана была скошана ўся, бо народ тут бедны, малазямельны і вельмі патрабуе сена. Дагэтуль, як помняць старыя людзі, ніколі пан не запускаў сенажаці на атаву, а сёлета запусьціў. Атава вырасла вельмі благая, дык яе зусім мала хто касіў, а хто й касіў, дык уся згніла, бо дажджы у гэты час ішлі часта.

Перад Пакровам за тыдні два сталі пасьціць акружаючыя вёскі скаціну. 13-га кастрычніка пан выпускае загад, што—хто ня прыйдзе на нараду, дык таго ня пусьціць пасьціць і што забараняць ён не забараняе, а забіраць скаціну будзе. Вядома. Пайшлі да пана, які й гавора, каб прынясьлі масла й сыраў, дык тады толькі можна будзе пасьціць. Гдзе-ж цяпер масла з сырамі, калі каровы пазарывалі й не даюць малака! Ня толькі для сябе, але й малым дзеткам няма".

Якуб Швайка.

Беніцкая воласьць Ашмянскага павету.

У двары Павізьзі нехта спаліў гумно з усім дабром. Пан гэтага двара арыштаваў аднаго жыхара-суседа, на якога меў благую ласку, бо судзіўся з ім за зямлю, пасадзіў да суду ў валасны карцар. Адміністрацыя не знайшла патрэбным трымаць пад арэштам і выпусьціла.

З гэтага мамэнту ўладары двароў панаймалі патрулёў-жаўнераў для ахраны будынку, а асабліва збожжа, якое яшчэ не змалочана. Гледзячы на ўладароў двароў, стала наймаць патрулёў і дробная шляхта.

Янка Пароюк.

Вялейскі павет.

Перад Пакровам згарэў двор пана Сьвентарэцкага. Згарэў ня толькі двор, але й сам пан. Шкілет яго знайшлі пасьля пажару на зялезным ложку.

М. Мышка.

Вёска **Доўгае** Вялейскага павету.

У гэтай вёсцы невядомымі людзьмі зарэзана адно сямейства. Меры супроць злачынцаў ніякія ня прымаюцца.

М. Мышка.

Весткі з Латвіі.

(*Ад уласных карэспандэнтаў*).

Беларуская вечарынка ў Люцыне.

ЛЮЦЫН, 24. X. 21. У нядзелю 22. X. 21 ў Люцыне адбылася Беларуская вечарынка, зробленая Люцынскім Аддзелам Беларускага Культурна-Прасьветнага Т-ва „Бацькаўшчына" ў Латгаліі і Люцынскім Гуртком Моладзі, што сарганізаваўся пры гэтым Т-ве і пры Люцынскай Мястовай Гімназіі.

Вечарына адбылася ў залі гімназіі, сабрала шмат народу і прайшла надта ўдачна.

Беларускі хор, кіраваны гр. Івановым, добра прапяяў некалькі беларускіх песьняў.

Вучні і вучаніцы гімназыі вельмі добра дэклямавалі.

Публіка засталася страшэнна задаволенай, шмат апледыравала і прасіла як-хутчэй паўтарыць вечарыну.

Ня гледзячы на вельмі танную плату за ўваход на вечарыну, яна дала добры збор, з якога 50% пайшло ў Касу Узаемнай Дапамогі Вучнёўскага Гуртка Гімназыі, а 50% на карысьць Т ва „Бацькаўшчына".

У будучую нядзелю Т-ва ладзіцца зрабіць па тэй жа праграме новую вечарынку.

С. П.

Беларускі спэктакль ў Дзьвінску.

ДЗЬВІНСК, 20. X. 21. У нядзелю 16. X. 21 ў Дзьвінску адбылася вечарына на карысьць Мясовай Дзьвінскай Багадзельні.

Беларускай трупай Таварыства „Бацькаўшчына" пастаўлена была п'еса „Зьбянтэжаны Саўка".

Вечарына рабілася аб'яднаным камітэтам усіх нацыянальных арганізацыяў места Дзьвінска і прайшла вельмі дружна і ўдачна.

П'еса і гульня беларускіх артыстаў вельмі падабалася ўсім прысутным.

Дзьвінскі.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

Польская марка падвышаецца, даражэе, а цэны на тавары ці спадаюць дужа нязначна, ці навет маюць нахіл да павялічэньня. Напрыклад, жыта некалькі дзён назад было ужо зьнізілася ў Вільні да 1800-1900 зз пуд, а на рынку 4. XI. пуд жыта ўжо каштаваў іаноў 2100-2200 мар. Такое самае павялічэньне цэн ідзе і на ўсе іншыя прадукты сялянскай гаспадаркі.

Дужа падаражэлі прадукты першай патрэбы, якія йдуць больш за ўсё праз Дэпартамэнт Аправізацыі, як: соль нафта і цукер. Соль павялічылася ў цане прапорцай на 70, а нафта з 700 марак за пуд павялічылася ў цане да 1500-1800 мар, за пуд. Селянін на павялічэньне цэн на прадукты, патрэбныя яму ў яго сялянскім жыцьці, будзе адказываць тым, што ў свой чарод павялічыць цэны на прадукты сялянскай гаспадаркі. Гэта ўжо і дацца алчуваць. Як толькі павялічылася цана на соль і нафту, пачала расьці цана і на жыта, ячмень, авёс і г. д. Зьменшылася апошні час ня дужа значна цана на галянтарэю, звычайнае мыла і іншыя прывозныя вырабы.

Варта адзначыць, што Апрабізацыйная Рада, замест таго каб вышукваць шляхі, як бы больш павялічыць прывоз прадуктаў, стала на шлях уціскаў гандлю. Гаворыць: „аб сьпекуляцыі", „схаваных складах", ідзе „рэгістрацыя гуртавых складаў" і г. д. Зразумела, што гэта толькі пагоршыць становішча спажыўца.

Дэпартамэнт уздумаў рабіць тавара замен з сялянамі, але вынікам гэтага было тое, што мяняць пачалі розныя сьпекулянты і падстаўныя людзі, а не запраўдныя сяляне. Сьмешна робіць замен на прадукты, якіх можна колькі хочучы і гдзе хочучы купіць і прадаць. Бальшавікі рабілі таваразамен пры страшэнным голадзе на тавары, а у нас „таваразамен" у Вільні, на Радунскай 50, ёсьць праапраемствам ня зышным. Час загатоўкі бульбы прайшоў. Ні Дэпартамэнт Аправізацыі, ні іншыя вялікія ўстановы не загатовілі на зіму гэты дужа патрэбны, асабліва беднаму люду, прадукт. Пачаліся маразы, і цэны на бульбу з 600 мар. падняліся да 800 і можна спадзявацца, што яны будуць расьці і далей.

Цяпер як раз пачынаецца пара загатоўкі жыроў і мяса: бараніны, сьвініны, сала. Сьвіньней ёсьць у нас дужа многа і загатовіць іх на зіму можна б было шмат. Вось на што трэба было-б зьвярнуць ўвагу і Дэпартамэнту і Аправізацыйнай Радзе.

Палепшыўся гандаль з заграніцай праз Гданск, дзякуючы падняцьцю польскай маркі. Падвозу у Вільню ідзе: селядцоў, мыла і розных іншых вырабаў з заграніцы, але ў Вільні прывозныя тавары мала падзешавелі.

7. XI. 921 г. С. Чыжэўскі.

☛ 1 лістападу ў Докшыцах Дунілавіцкага павету былі вось якія цэны: жыта 1600 — 1800, авёс—2000, бульба—350, саланіна 750, мяса ялавічына 175—200, сьвініна—400, бараніна—200, масла кароўскае 650—680, яйкі штука—30, малако кварта—70-80, хлеб чорны—50, капуста пуд 400, буракі—300, цыбулі хунт—50-60 польскіх марак.

☛ У гэтым месяцы выйдзе з друку „Коопэратыўны календар на 1922 г.", выданы пабеларуску Віленскім Саюзам Каапэратываў.

Апрача календарных даных, артыкулаў аб каапэрацыі і яе гісторыі у нашым краю, у календары будуць зьмешчаны практычныя парады па каапэратыўных справах.

☛ У кастрычніку (акцябры) месяцы Віленскі Саюз Каапэратываў прадаў тавараў на суму 33.133.061 марак, а купіў на суму 26.672.092 мар. У сярэднім Саюз прадаваў у дзень на 1.274.346 мар., тады як у верасьні на 1.193.000 а ў жніўні на 582.712 мар.

Аддзелы Саюзу у кастрычніку месяцы прадалі тавараў на суму 12.874.310 м. (у верасьні на 8.748.983 м.) а сабралі у Вільню розных прадуктаў на суму 4.819.210 (у верасьні на 1.019.730 мар.).

☛ За кастрычнік у Віленскі Саюз Каапэратываў упльыло паевых унёсаў ад таварыстваў на суму 544.964 марак.

☛ У Браслаўлю 19 кастрычніка адбыўся зьезд прадстаўнікоў каапэратываў. Зьявілася дужа мала прадстаўнікоў. Старшынёй зьезду быў паветовы старастa. Інструктар „Стражы Крэсовэй"—Устунскі прапанаваў адчыніць у Браслаўлю Аддзел „Цэнтралі Ставажшэнь Рольнічa-Гандлёвых". Так і пастанавілі.

☛ Аддзел у Обсе Віленскага Саюзу, ня гледзячы на тое, што у кастрычніку перавяжджаў з Дукшт у Обсу, прадаў тавараў прывезенных з Вільні на суму 4.200.000 і апроч гэтага адаслаў у Вільню тавараў купленных на месцы на вялікую суму. Апошні час зьвеі гатоўкі каля 800.000 мар.

☛ З усіх паветаў прыфрантовай паласы адзін толькі Дунілавіцкі у васобе Старостве не дазваляе увазіць нафту і соль. Даражыня на гэтыя прадукты страшэнная.

☛ У Пастаўскім раёне паўстала каля 4 новых каапэратываў, якія карыстаюцца з Аддзелу у Паставах, забіраючы тавары. Усе гэты каапэратывы далучыліся да Віленскага Саюзу.

☛ Каапэратывы, што групуюцца каля станцый Будслаў-Парахвіянава, дамагаюцца, каб там Віленскі Саюз адчыніў свой Аддзел.

☛ На паседжаньні Рады Маладзечанскага раёну каапэратываў высьветлілася, што Аддзел у Маладзечне ў поўнай меры не задаваляе каапэратывы.

Раённая Рада пастанавіла адчыніць бібліятэку пры Аддзеле і зробіць яе рухомаю; асігнавана на гэта 25.000 мар.

☛ Інструктар Гармановіч будзе працаваць выключна ў Маладзечанскім раёне. У раён Залесьсе выяжджае інструктар Арс. Канчэўскі.

☛ Кіраўнік Багданаўскага пункту В. С. К. п. Бэднаровіч перайшоў на працу у Лідзкі Саюз; Ен будзе кіраваць усёй гандлевай дзейнасьцю Лідзкага Саюзу.

☛ Залескі пункт Віл. Саюзу Каап. высылаець і далей вагоны бульбы. За апошнія два тыдні высланы у Вільню яшчэ тры вагоны бульбы.

ЦЭНЫ ПРАДУКТАУ НА ВІЛЕНСКІМ РЫНКУ

	18. X	21. X	25. X	4. XI.
жыта	2.200	1.950	2.100	2.100
ячмень	2.100	2 000	1 900	2.000
авёс	1 900	1.800	1.900	1.900
белы гарох	—	2.000	—	2.400
бульба	600	550	600	700
саланіна	520	500	500	500
масла	950	1.000	1.000	900
яйкі	35	40	40	45
чорны хлеб	50	48	50	48
белы хлеб	80	80	80	75
капуста	750	700	750	750
буракі	600	450	550	600
морква	700	—	600	750
цыбуля	1.750	2.000	1.800	2.000
бручка (грыжына)	700	500	600	600

☛ Цана на нафту ў Вільні ў прыватным гандлю падвысілася да 1800 марак. Дэпартамэнт Аправізацыі прадае нафту па цане каля 1300 марак за пуд.

☛ Соль у Дэпартамэнце Аправізацыі паднялася ў цане болі, як у два разы, дзеля таго што саляныя капальні ў Польшчы паднялі дужа на многа цану.

ХРОНІКА.

☛ Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прыслаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

☛ ГРАМАДЗЯНЕ!

Педагогічная Рада 1-ае Віленскае Беларускае Гімназіі пачала арганізаваць папулярную і навуковую бібліатэку для сваіх вучняў. Да апошняга часу справа гэта стаяла так: кніг было мала, а падручнікаў і навуковых кніг было яшчэ менш. Цяпер Педагогічная Рада хоча папоўніць гімназіяльную бібліатэку кнігамі і падручнікамі па ўсім краінам знацьця, каб даць дзяцём вельмі незаможных, бедных бацькоў магчымасьць карыстацца патрэбнымі навуковымі падмогамі.

Грамадзяне, ахвяруйце грошы, прыносьце і прысылайце кнігі. Кожная новая кніга зьменшыць сучасную, нячуваную дагэтуль патрэбу ў навуковых падмогах, пашырыць беларускую асьвету.

Ахвяры грашмі і кніжкамі на усіх мовах прыймаюцца што дзень у час лекцый (9-2 г.) ў будынку гімназіі—Вострабрамская 9, загадчыкам бібліатэкі, вучыцелем М. Красінскім.

М. К.

☛ Беларускаму Музыкальна-Драматычнаму Гуртку удалося ізноў знайці частку пакіненай у 1915 г. сваей маемасьці. Знайшлась яна ў гаспадара танцклясы п. Бароўскага.

☛ „Виленское Утро" паведамляе са слоў пейкай пеўнай асобы, нядаўна прыбыўшай з Менска, што старшыня саўнаркома Беларусі Чарвякоў скінут з займанай ім пасады. Прычынай зьявілась быццам-то апошняя нота Савецкай Беларусі польскаму ўраду, падпісаная Чарвяковым на ўласны пачынак. Чарвякоў скінут па загаду з Масквы і на яго месца назначан Адамовіч, бышы вайсковы камісар.

Зьмяшчаем гэтую вестку для цікаўнасьці, хаця ў пеўнасьць яе ня ймецца веры.

☛ Панядзелкавая газэта „Nowiny Wileńskie" перадрукавала ў №№ 58-59 Мэморыял Цэнтральнае Беларускае Школьнае Рады міністру асьветы Польскай Рэспублікі.

☛ Просім купляць зборнікі „Беларускіх Ведамасьцей" не адкладаючы на даўжэйшы час, бо грошы, вырученыя ад гэтай продажы, пойдуць на выданьне „Дэкляматара". Чым болей разойдзецца зборнікаў, тым паўнейшы будзе „Дэкляматар"

☛ У м. Ярэмічах Наваградскага павету 16—X—1921 г. быў беларускі спектакль, згуляны тутэйшымі сіламі (грамадзян К. Клаўсуця, М. Навумовіча, Е. Будоль, Н. і Г Груша, А. Лічка, Н. Станкевіча і інш.). Згулялі драму „Страхі Жыцьня" Ф. Аляхновіча і камэдыю „Конскі патрэт" Л. Родзевіча. Тэатр (у гумне) быў бітма набіты і ня стоўпіў усіх хацеўшых глядзець.

☛ Просім прысылаць у рэдакцыю „Беларускіх Ведамасьцей" па 2 экземпляры афіш, праграм і інш. падобнага матарыялу ад кожнага беларускага сьпектакля, канцэрта, лекцыі і г. д.—для перадачы у Беларускі Нацыянальны Музей ў Вільні імя І. Луцкевіча.

☛ Студэнты-беларусы Віленскага Універсытэту арганізоўваюць беларускі саюз студэнтаў.

„(Бел. Зв.").

☛ Беларускі Музыкальна-Драматычны Гурток у Вільні згуляў у суботу 12 лістапада камэдыю „Сышчык".

☛ У блізкім часе мае быць у Вільні суд п. Аляксюка з рэдактарам зачыненага уладаю „Виленскаго Слова" п. Мейціным—за весткі ў гэтай газэце аб справах п. Аляксюка.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Грамадзянін Рэдактар!

Дзеля часовага закрыцьця Уладай „Krупісу", не магу я ўвёй даць адказ Паўлу Аляксюку на ягоны „ліст у рэдакцыю" (Jednaść № 26) з прычыны стацьці „Alaksiuk", ў „Krупісу" №32. Дык не адмоўце зьмясьціць у гэтай справе слоў некалькі у Вашай паважанай газэце.

Аляксюк у сваім лісьце між іншым піша, што найлепшым адказам на ўспомненую стацьцю будзе—„пацягнуць да адпаведнасьці (падчыркнуў я) перад судом рэдактара „Krупісу", „За дыплямацыю" (падчыркнуў я)

Такі зьмест аляксюкоўскага пісьма выглядае на нейкі звычайны жарт. Напісаць: пацягнуць каго да адпаведнасьці перад судом мог-бы толькі чалавек, страціўшы беларускі характар, бо такая гутарка—гэта нейкі польска-беларускі жаргон, які трудна нат' і зразумець. Але дадумаваемся, што такім жаргонам Аляксюк хацеў выявіць сваё жаданьне падаць рэд. „Krупісу" у суд. Мы ня дзівімся, што Аляксюк можа і ня ўмець па беларуску, бо тыя, каму ён служыць, гэтага ад яго не вымагаюць. Дзівіць нас толькі тое, што Аляксюк страціў нат'ужо і розум, бо ён хоча судзіць рэдакцыю „Krупісу" за дыплямацыю. (?!)

Дарэмна' за надта вы нізка ўпалі у вачах усяго беларускага грамадзянства, каб маглі вы падыктаваць „Krупісу", якой яна мае трымацца дыплямацыі. А даносы на нас перад уладай, да якіх вы майстар, не памогуць нічога!

Калі-ж гэна «умопомраченіе» ад Аляксюка не адступіцца і мы (Сьвятляк, аўтор стацьці «Аляксюк» або п. рэдактар „Krупісу"), будзем змушаны спаткацца з Аляксюком у судзе, дык з прыемнасьцю туды зьявімся, каб публічна здэмаскаваць Аляксюка як ворага беларускай справы, як адступніка ад яе і як.., але аб гэтым там скажам, на што маем дакумэнты і сьведкі.

З пашанай Я. Сьвятляк.

12.11. 21. Вільня.

Паштовая скрынка.

В. Сосенскаму. Газэту пасылаем Вам акуратна. Дзякуем за карэспандэнцыі.

Курс на грошы ў Вільні.

13 лістапада 1921 г.

	мар.
Царскія (100 р.)	450
Нямецкія маркі (1000)	20
Осты (100)	19,75
Даляры	3930
Золата рублі (10)	15900

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзе больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісьвацца, бо ад гэтага залежыць далейшае жыцьцё «Беларускіх Ведамасьцей». Хто ня ўмее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і сацыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Браты, прыміце блізка да сэрца ўсе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці" ў вашым раёне выпісываліся і пашыраліся.

Хай жывець народная справа!

Адрас: Wilno, Ostrobramska № 9, „Беларускія Ведамасьці".

Беларускі паказальнік:

Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт—Вострабрамская вул. № 9. **У тым-жа будынку:** Школьная Рада, Гімназія, Прытулак і інш. установы.
Віленскі Беларускі Музык.-Драматыч. Гурток—Біскупская в. № 12-6.
Беларускае Выдавецкае Таварыства — Вільня, Віленская вул, д. 33, кв. 1 (ад 4-5 гадзіны)
Беларускі каапэратыў „Райніца" Вільня, Вялікая Пагулянка, 17.
Віленскі Саюз Каапэратываў—Вільня, Малая Пагулянка, 12.
Каапэратыўная друкарня „Друк"— Вільня, Субач, 2.
Рыскі аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына"—Latwija, Riga, Nikołaj ul'a 20 dz. 1.
Беларускае Культурна Прасьветнае т-ва „Бацькаўшчына" у Латгаліі—Latwja, Riga, Witebskaja, 16.
Люцынскі Аддзел Беларускага Културна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына" у Латгаліі—Latwija, Ludze? Sjebežskaja, 66.
Рада Беларускай Калёніі у Латвіі—Latwija, Riga, Bulw. Totlebena, 7-3.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый на сьвеце з просьбаю — прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.

Рэдактар і Выдавец Максім Гарэцкі. Друкарня „ДРУК", Субач 2.